Увага! У пятніцу, 21 снежня, апошні дзень падпіскі на "Газету Слонімскую" на першае паўгоддзе 2002 года



Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Пейджынговую связь "ГС" обеспечивает НП ООО "Защита-Сервис". ТЕЛЕФОН В Г.ГРОДНО (8-22)-75-00-66, В Г.СЛОНИМЕ 2-64-44.

Газета Слонімская

№51 (237). 20 — 26 снежня 2001г. Масава-палітычны штотыднёвік Наклад 11.200 экз. Кошт 200 руб.

Чытайце на старонках "ГС"

ПРЫЦІСНУЛІ ПЕРШЫЯ МАРАЗЫ



Сёлета снежань пачаўся з маразоў: ноччу і пад раніцу яны дасягаюць 20 градусаў. Стала халадней у кватэрах і хатах. Таму прыйшоў час часцей падкідваць дровы ў печку. Як паведамілі карэспандэнту "ГС"у прадпрыемстве гарпаліва, сёння адзін складны метр гатовых дроў каштуе 4700 рублёў, а брыкету можна выпісаць толькі 2 тоны на адну хату. Вядома, лепш за ўсё пра паліва паклапаціцца летам ці восенню, тады і маразы будуць ні па чым. А што рабіць гэтай жанчыне, калі уся гаспадарка – на яе плячах? Вось і сячэ яна дровы, як можа, каб не замерзнуць.

Сяргей ЧЫГРЫН,
Фота Віталя [illegible]

ПЕРАНОСЯЦЦА РАБОЧЫЯ ДНІ

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў рабочы дзень з серады, 2 студзеня, пераносіцца на суботу, 5 студзеня; з пятніцы, 10 траўня – на суботу, 18 траўня; з панядзелка, 13 траўня – на суботу, 25 траўня; з пятніцы, 8 лістапада – на суботу, 16 лістапада 2002 года.

НАВІНЫ

НОВОГОДНЮЮ ЁЛКУ ДЕШЕВЛЕ КУПИТЬ

Слонимский лесхоз уже начал заготавливать елки для населения к новогодним праздникам.

Их продажа будет производиться в четырех точках города: в лесхозе, в Альбертинском лесничестве, на Энке, в районе газопровода. Стоимость каждой елки будет зависеть от ее размера.

Так, елка высотой от 1 метра до 2-х будет стоить 1500 рублей, от 2 до 3 метров – 1800 рублей, от 3 – 5 метров – 2100 рублей, от 5 – 6 – 3600 рублей.

Распродажа елок начнётся с субботы, 22 декабря.

Отметим, что за самовольную рубку елок, по словам главного лесничего лесхоза Михаила Киселя, предусмотрен штраф в размере от 8 до 28 тысяч рублей.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЦІ ДАЛУЧАЦЬ ЛІДСКІ МЯСАКАМБІНАТ ДА СЛОНІМСКАГА?

Выступаючы нядаўна па Гродзенскім тэлебачанні старшыня албвыканкама Уладзімір Саўчанка сказаў, што з пяці мясакамбінатаў Гродзенскай вобласці неабходна пакінуць толькі тры.

Пракаменціраваць словы губернатара карэспандэнт "ГС" папрасіў дырэктара Слонімскага мясакамбіната Алега Бярдулу, які, у прыватнасці, сказаў, што гэта толькі планы на будучае. Размова сёння вядзецца наконт двух мясакамбінатаў – Лідскага і Ашмянскага.

Плануецца іх далучыць да нашага Слонімскага мясакамбіната ці Ваўкавыскага. Але, яшчэ раз падкрэслю, — сказаў Алег Раманавіч, — што гэта толькі планы.

Сяргей ЧЫГРЫН

Курсы обмена валют в г.Слониме по состоянию на 18 декабря 2001г.

"Приорбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1565	1610
1 DM	670	730
1 RUR	51	53
"Беларусбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1575	1605
1 DM	680	725
1 RUR	51	53
ОАО "Белпромстройбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1565	1605
1 DM	695	725
1 RUR	51	53
"Белагропромбанк"		
	Покупка	Продажа
1 USD	1560	1600
1 DM	650	710
1 RUR	51	53
Нацбанк РБ		
1 EURO	1417.24	

Цены на слонимском рынке по состоянию на 18 декабря 2001г

Продукт	Цена за кг
Гранаты	300 — 500 (шт.)
Бананы	1000 — 1100
Апельсины	1400 — 1600
Яблоки	400 — 900
Киви	250 (шт.)
Помидоры	1700
Капуста	400
Морковь	450 — 500
Лук	600 — 700
Чеснок	1500 — 2000
Картофель	200
Молоко	300 (л.)
Творог	800 — 900
Масло	3200
Яйца	1500
Свинина	4000 — 5500
Говядина	4500 — 5000
Баранина	4000 — 4500
Сало	3200 —3500
Телятина	4500 — 5000
Мед	5500 — 6000
Сметана	1200 — 1400
Лимоны	1400 — 1600
Мандарины	1800 — 2000

НАВІНЫ

ЧАКАЕЦЦА РАКІРОЎКА

У Слоніме ўжо даўно вядуцца размовы наконт аб'яднання горада і раёна. У сувязі з гэтым ходзяць і самыя розныя чуткі. Атрымаць канкрэтную інфармацыю пры ўсіх намаганнях проста немагчыма.

Тым не менш нашых чытачоў хвалюе: хто зойме пасаду старшыні аб'яднанага райвыканкама? На гэта месца, як стала вядома карэспандэнту "ГС", пакуль прэтэндуюць сённяшні старшыня райвыканкама Мікалай Пахолак і былы дырэктар Слонімскай КПФ Вячаслаў Баркоўскі, які ў апошнія гады працуе адным з намеснікаў Гродзенскага аблвыканкама. Цяпер Мікалай Пахолак знаходзіцца ў бальніцы ў кардыялагічным аддзяленні. Туды ён трапіў на мінулым тыдні.

Вядома, што з рэарганізацыяй адміністратыўнай адзінкі адбудзецца і ракіроўка сярод чыноўнікаў гарраймвыканкамаў. Людзі кажуць, што ўсіх пенсіянераў адправяць на заслужаны адпачынак, маўляў, кабінетчыкі і так стараліся з усіх сіл працаваць, стаміліся, пара ўжо і адпачыць. А тыя, каму яшчэ да пенсіі далёка, без працы не застануцца. Для іх даўно забраніраваныя месцы, напрыклад, у гарадскіх навучальных установах, службовых кантораx, дзе да сённяшняга дня працуюць пенсіянеры. Карацей, адных павысяць па службовай лесвіцы, а другіх могуць і пакрыўдзіць. Трымаецца ў тайне і новая пасада для Алега Лакцюшына. Ужо некалькі дзён "гудзе" і Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка, вытворчаць якой у апошні час амаль прастойвае. І месца цяперашняга дырэктара гэтага прадпрыемства Віктара Галіча ўжо заняў Павел Карняйкоў.

Адным словам – у Слоніме чакаюцца кадравыя змены сярод чыноўнікаў і кіраўнікоў. Падобныя ракіроўкі ў маштабах рэспублікі цяпер адбываюцца амаль штомесяц. Але лепшага жыцця для простага чалавека ад падобных перастановак пакуль не прадбачыцца. А тым больш у нашым правінцыяльным гарадку.

Сяргей ЧЫГРЫН

СУМНЫ ЮБІЛЕЙ У КАМУНІСТАЎ



Выступае ветэран партыі і Вялікай Айчыннай вайны Іван Прусевіч.

Фота Віталя ГІЛЯ

На мінулым тыдні Партыя камуністаў Беларуская (ПКБ) адзначыла сваё дзесяцігоддзе.

З гэтай нагоды ў Слоніме ў малой зале РДК на юбілейную вечарыну сабраліся 16 мясцовых камуністаў, у асноўным, людзей пенсійнага ўзросту, якія і складаюць цяперашнюю слонімскую арганізацыю ПКБ. Сярод іх прысутнічалі такія ветэраны створаней у 1991 годзе партыі як Мікалай Фаміч Маскаленка і Іван Якаўлевіч Прусевіч. Пасля развалу КПСС менавіта яны сталі ініцыятарамі стварэння ў Слоніме новай камуністычнай арганізацыі.

Першы сакратар слонімскай арганізацыі ПКБ Віктар Герасімчык у сваім выступленні адзначыў заслугі гэтых людзей перад партыяй і выказаў спадзяванне, што з часам шэрагі камуністаў павінна папоўніць моладзь. Але для гэтага патрэбна крапатлівая праца. Віктар Фёдаравіч выказаў таксама шкадаванне, што ніхто з запрошаных на вечарыну з іншых грамадскіх арганізацый, і ў прыватнасці з мясцовага БПСМа, так і не палічыў патрэбным прыйсці. А вось з Мінска ў госці да слонімскіх камуністаў прыехаў намеснік галоўнага рэдактара партыйнай газеты "Товарищ", першы сакратар ЛКСМ Беларусі Дзмітрый Яненка. У сваім выступленні мінскі госць выказаў цікавую думку наконт таго, што, каб перамог сацыялізм, у краіне адразу патрэбна пабудаваць развітое капіталістычнае грамадства.

А ўвогуле, усе выступоўцы адзначалі, што зараз у Беларусі няма ўмоў для развіцця адкрытага грамадства і адраведна — для партыйнага будаўніцтва.

Мікола КАНАНОВІЧ

КІНО ЎСЁ Ж ГЛЯДЗЯЦЬ

17 снежня кінематаграфісты і кінапракатчыкі адзначылі сваё прафесійнае свята — Дзень беларускага кіно.

З гэтай нагоды карэспандэнт "ГС" звязаўся з дырэктарам Слонімскага кінавідэапрадпрыемства Казімірам Мацievічам і пацікавіўся, як зараз працуе мясцовы кінапракат.

Казімір Іосіфавіч сказаў, што цяпер у Слоніме кіна- і відэафільмы паказваюць у кінатэатры "Мір", у альбярцінскім клубе падчас канікулаў для дзяцей. Таксама для школьнікаў і навучэнцаў — у сярэдніх школах №9 і №10, і ў сельскагаспадарчым ліцэі. Паказваюць фільмы таксама і ў 18 вёсках Слонімскага раёна: Дзеравянчыцах, Жыровічах, Шылавічах, Петралевічах, Талькаўшчыне, Дзераўной, Васілевічах, Міжэвічах, Селявічах і іншых. На вёсцы кіно паказваюць, у залежнасці ад колькасці гледачоў, 12, 18 ці 21 раз у месяц. Некаторыя кінамеханікі працуюць па 30 і больш гадоў. Гэта такія ветэраны кінасеткі як Вольга Жолудзь у Міжэвічах, Соф'я Валадчынкава ў Мяльканавічах, Вера Цвікевіч у Жыровічах, Ігар Калюцік у Дзераўной, Іван Дабрыян у Мяльканавічах і Талькаўшчыне. А вось Зінаіда Быкава з Азярніцы, Валянціна Трухан з Шылавіч, Ганна Сянькевіч з Рахавіч працуюць ужо каля 10 гадоў.



Кадр з фільма Міхаіла Пташука "У жніўні 44-га...", здымкі якога адбываліся ў Слоніме. Гэта адзіны з беларускіх фільмаў, які апошнім часам дэманстраваўся ў краінах Еўропы, а напрыканцы гэтага года на яго паступіў заказ і з ЗША.

І хоць у наш час у кінапракаце хапае праблемаў, але, як адзначыў Казімір Мацievіч, кіно ўсё ж застаецца запатрабаваным. Не ў такой колькасці, як гэта было раней, але на добрыя фільмы людзі ходзяць і зараз. У кінатэатры "Мір" акрамя таго працуе Клуб элітарнага кіно.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАВІНЫ

ВЫБРАЛІ НОВАГА ДЫРЭКТАРА КПФ

18 снежня ў таварыстве з абмежаванай адказнасцю "Слонімская камвольна-прадзільная фабрыка" адбыўся сход акцыянераў, на якім вырашаліся пытанні аб вызваленні з пасады дырэктара фабрыкі Віктара Галіча і прызначэнні новага кіраўніка прадпрыемства.

За два тыдні да сходу ў ў канцэрн быў вызваны Галіч, якому прапанавалі напісаць заяву аб звальненні па асабістаму жаданню. Што ён і зрабіў. На пасаду дырэктара прапаноўваліся кандыдатуры начальніка аддзела маркетынгу КПФ Юрыя Матавіцкага ад калектыва фабрыкі і былога дырэктара Слонімскай фабрыкі мастацкіх вырабаў Паўла Карняйкова ад гарвыканкама і канцэрна. У суботу, 15 снежня, Юрыя Матавіцкага выклікаў да сябе губернатар вобласці і прапанаваў напісаць заяву аб зняцці сваёй кандыдатуры на дырэктарскую пасаду, што той і зрабіў. Такім чынам засталася толькі кандыдатура Паўла Карняйкова. Гэта выклікала пэўнае незадавальненне сярод калектыву КПФ. Але тым не менш, на пасаду дырэктара прадпрыемства большасцю галасоў акцыянераў быў абраны 53-гадовы Павел Карняйкоў. І першае, што ён прапанаваў зрабіць пасля абрання — правесці інвентарызацыю і аўдыт гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства. Гэта незадаволіла некаторых намеснікаў кіраўніка фабрыкі, і адзін з іх адразу напісаў заяву аб звальненні па ўласнаму жаданню.

Мікола КАНАНОВІЧ

ВСТРЕЧА ЖУРНАЛИСТОВ В ЖИРОВИЧАХ

15 – 17 декабря в Минской духовной академии в Жировичах прошла встреча светских и церковных журналистов.

Участники приняли итоговый документ, в котором говорится: "Последние 10 лет стали периодом становления и развития православной прессы. Печатные издания ныне являются значимым фактором внутренней миссии церкви и формируют ее облик в обществе. Радостно отметить, что почти каждая епархия теперь имеет один или несколько печатных органов, которые ориентированы на самые разные слои общества".

Сергей ЧИГРИН

Афіша

ДРАМТЭАТР

23 снежня
"Зімовая казка" (для дзяцей). Пачатак у 12 гадзін.

23 снежня
"Сямейны партрэт з чужым". Пачатак у 17 гадзін.

КІНАТЭАТР "МІР"

20 снежня
"Прывід" (жахі). Сеансы ў 17, 21.
"Ісус" (бясплатна). Сеансы ў 15, 19.

21 снежня
"Марнуючы жыццё" (камедыя). Сеансы ў 17, 21.
"Ісус" (бясплатна). Сеансы ў 15, 19.

22 снежня
"Сакрэтны агент" (баявік). Сеансы ў 17, 21.
"Ісус" (бясплатна). Сеансы ў 15, 19.

23 снежня
"Снягурачка" (для дзяцей). Сеанс у 13.
"Паляўнічы" (баявік). Сеансы ў 15, 17, 19, 21.

24 снежня
"Ноч перад Калядамі" (мультфільм). Сеанс у 13.
"Чорны ястраб" (баявік). Сеансы ў 15, 17, 19, 21.

ДА 750-ГОДДЗЯ СЛОНІМА

ПРЫЗНАННЕ Ў ЛЮБОВІ РОДНАМУ СЛОНІМУ

Пад такой назвай прайшло ў СШ №10 адкрытае пасяджэнне клуба "Спадчына", якім кіруе настаўніца беларускай мовы і літаратуры Таццяна Трафімчык.

Пачала мерапрыемства сама Таццяна Уладзіміраўна кароткім апавядам пра Слонім, а потым перадала слова юным паэтам з літаратурнага гуртка. Тэма роднага горада гучала ў вершах Светы Кудзелькі, Пашы Дуброўскага, Славы Бекеты, Пашы Сашко, Вольгі Ганчарук і многіх іншых. У госці да юных талентаў завіталі гаспадар хаты-музея "Беларускае мястэчка" Міхаіл Рылко, загадчык школьнага музея ў дзесятай школе паэт Іван Карповіч, мастачка, выкладчык выяўленчага мастацтва Таццяна Салыга і школьныя настаўнікі. Міхаіл Рылко цікава расказаў дзецям пра старэйшага слонімскага паэта Гальяша Леўчыка і падараваў адрэстаўраваную акарыну (гліняная дудка), на якой калісьці іграў Леўчык. Таццяна Салыга паказала некаторыя свае мастацкія працы і прачытала некалькі вершаў. Іван Карповіч у сваім выступленні пра гісторыю Слоніма засяродзіў увагу прысутных на асобе Льва Сапегі і таксама чытаў вершы. Дарэчы, як паведаміў Іван Іванавіч, хутка ў музеі СШ №10 з'явіцца вялікі партрэт Льва Сапегі работы аднаго са слонімскіх мастакоў.

Закончылася пасяджэнне школьнага клуба "Спадчына" гістарычнай віктарынай.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАВІНЫ

ЛАЎРЭАТКА З СЯНЬКОЎШЧЫНЫ

Вучаніца 8 класа Сянькоўшчынскай сярэдняй школы Таццяна Бабіла заняла трэцяе месца на абласным конкурсе творчых прац школьнікаў, прысвечаных 110 гадавіне з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча.

Нагадаем, што творчая праца Таццяны "Сад беларускасці або Максімаў сад" у газетным варыянце друкавалася ў мінулым нумары "ГС".

Мікола КАНАНОВІЧ

КАКОВА ЖЕНЩИНА – ТАКОВО И ОБЩЕСТВО

Состоялась III отчётно-выборная конференция Гродненского областного совета женщин.

На ней с докладом выступила заместитель председателя облисполкома, председатель областного совета женщин Мария Бирюкова. Она, в частности, сказала, что сегодня в Гродненской области насчитывается 20,8 тысячи больных алкоголизмом, 440 – наркоманией, 15 – токсикоманией, из них женщин – 2634.

В области на 7209 браков пришлось 4504 развода(62,5%). Восемь детей родились у матерей, возраст которых составляет 15 лет и моложе, сорок детей – у 16-летних, 149 – у 17-летних.

По сравнению с 1994 годом в 2000 году количество населения в Гродненской области уменьшилось на 31,9 тысячи человек. Наибольший процент снижения сельского населения произошёл в Мостовском, Дятловском и Волковысском районах.

На учёте в инспекциях по делам несовершеннолетних в 2000 году было 2280 детей и подростков. За 10 месяцев этого года 504 подростка совершили преступления, – сказала Мария Бирюкова.

Сергей ЧИГРИН

ІНТЭРВ'Ю



Ірына Яцук

Ірына Яцук: Я – ЧАТЫРЫЖДЫ ЛІСА СЛОНІМСКАГА ДРАМТЭАТРА

Сёлета артыстка Слонімскага беларускага драматычнага тэатра Ірына Яцук стала дыпламантам Другога Рэспубліканскага фестывалю тэатральнай моладзі. Яе ролю Чорта ў спектаклі "Камедыя" журы прызнала самай лепшай жаночай роллю.

Сёння артыстка Ірына Яцук адказвае на пытанні карэспандэнта "ГС".

— Ірына, Вы ўжо шмат гадоў працуеце ў нашым Слонімскім тэатры. Што даў Вам тэатр за гэтыя гады?

— Цяжка адразу сказаць. Паўстае другое пытанне – што я яму дала? А калі сур'ёзна, дык у Слоніме я навучылася акцёрскаму майстэрству, хаця мне яшчэ да сцэнічнай дасканаласці вельмі далёка.

— А можа лепш было, як гэта зрабілі многія артысты, пераехаць у Маладзечна, Гомель, Мінск?

— Дарэчы, мяне туды запрашалі, але я нікуды са Слоніма так і не паехала. Стрымліваў мяне найперш страх, што я не спраўлюся з тымі патрабаваннямі, якія мне прад'явяць. І па-другое, я не змагла нікуды паехаць па сямейных абставінах. А што далей будзе – пакажа час.

— Як Вы трапілі ў Слонім? Наколькі мне вядома, Вы родам з Шуміліна Віцебскай вобласці?

— Найперш сябры. Гэта Сяргей Бачкоў і Віктар Небальсін. Дарэчы, яны працавалі і ў Слоніме. Сяргей Бачкоў – артыстам і рэжысёрам, а Віктар Небальсін – рэжысёрам. Цяпер Бачкоў з'яўляецца артыстам Гродзенскага абласнога драмтэатра, а пра Небальсіна чула, што ён плануе прыехаць у наш тэатр і адлавіць свой спектакль "Пакрыўджаныя" па п'есе Уладзіслава Галубка. Гэта вельмі таленавітыя хлопцы, яны шмат зрабілі для Слонімскага беларускага драмтэатра. Я з імі пазнаёмілася ў Мінску, калі вучылася ва ўніверсітэце, а яны ў інстытуце культуры. Часам прыходзіла да іх на рэпетыцыі, слухала іх, вучылася тэатральнаму майстэрству. Яны і прапанавалі мне прыехаць на працу ў тэатр. Што я з задавальненнем і зрабіла. Хаця па спецыяльнасці я настаўніца геаграфіі.

— Якая Ваша самая першая роля была ў нашым тэатры?

— Мне доўга нічога рэжысёры не прапаноўвалі. А пасля мне давэрылі ролю лісы ў спектаклі "Крыштальная сняжынка". Мяне проста выпхнулі калегі на сцэну, я вельмі баялася пачынаць. Але дэбют удаўся, і да сённяшняга дня я люблю гэтую ролю.

— Як я памятаю, Вы ў некалькіх спектаклях ігралі ліс?

— Так, я – чатырыжды ліса Слонімскага драмтэатра.

— Вам, відаць, казачныя ролі больш падабаюцца?

— У спектаклях для дзяцей акцёр адчувае сябе больш вальней, ёсць прастор для фантазіі, для імправізацыі. А ў спектаклях для дарослых трохі не так. Там трэба строга выконваць тое, што загадвае рэжысёр.

— Якая Ваша самая любімая роля?

— Люблю Мар'ю ў спектаклі "Каханне з падманам", Марыю ў "Непаразуменні", хоць гэта цяжкая роля. Падабаецца Дзіна ў спектаклі "Пакуль яна памірала", але гэта не мая роля, я яе да канца так і не адчула. Я рэжысёру казала. Але гледачам падабаецца, гэта мяне радуе.

— А ці падабаецца Чорт у спектаклі "Камедыя"?

— "Камедыю" ставіў рэжысёр Віктар Небальсін. На ролю Чорта былі зацверджаны іншыя акцёры, а я проста "вырвала" для сябе гэтую ролю. І рэжысёр пагадзіўся, каб я іграла Чорта. Слова "чорт" – мужчынскага роду. Але рэжысёр захацеў, каб менавіта жанчына выканала ролю Чорта.

— Як гледачы ўспрынялі гэты персанаж у Вашым выкананні?

— Па-рознаму. Адным ён спадабаўся, другім – не. Некаторыя казалі, што вось знайшлася яшчэ адна Дзямідава: тая хацела сыграць Гамлета, а Яцук іграе Чорта. Але гэта была задумка рэжысёра. Ды і мне хочацца паспрабаваць сябе і ў камедыйным жанры, і ў трагедыйным. Я шчыра люблю свайго сцэнічнага героя.

— Каго хацелася б сыграць на слонімскай сцэне?

— Шмат каго. Але найперш мару пра Васу Жалязнову. Хаця ў спектаклях, якія ставяцца па п'есах класікаў, працаваць вельмі цяжка. Тым не менш, я хачу сыграць Васу Жалязнову.

— Рэжысёры Вам даюць тыя ролі, якія яны хочуць, ці што пажадае акцёр, у якой ролі ён больш за ўсё сябе бачыць?

— Не. Якія ролі прапануе рэжысёр, над тымі і працуем. Наш галоўны рэжысёр Віктар Бутакоў спрабуе акцёраў у самых розных амплуа. Хаця не заўсёды гэта на карысць пастаноўкам і акцёрам.

— З кім са слонімскіх акцёраў Вам лёгка працаваць на сцэне?

— Вельмі прыемна, калі тваім партнёрам па сцэне з'яўляецца артыстка Наталля Шугай. Яна не толькі грае сваю ролю, але дапамагае іншым. Цікава было з Таццянай Натаравай, якая, на жаль, ужо не працуе ў тэатры. Асабліва ў нас добра атрымліваліся адмоўныя героі ў дзіцячых спектаклях. Дзеці такіх казачных герояў запаміналі.

— Кожны акцёр у тэатры мае сваю катэгорыю. Да якой катэгорыі даслужылі Вы?

— Я з'яўляюся артысткай першай катэгорыі. З вышэйшай катэгорыяй у нас толькі адна Тамара Галаванава. А да майстроў сцэны нам, мусіць, не даслужыць.

— Тым не менш, артыстка першай катэгорыі атрымлівае на фестывалі прыз за лепшую ролю?..

— Выходзіць так.

— Пра што Вы, Ірына, марыце ў сваім асабістым жыцці?

— Адна-адзіная мара – атрымаць кватэру. Мне ўжо надакучыла швэндацца па інтэрнатах, ды і дачка ў мяне падрастае. А да яе нават няма куды прыйсці сяброўкам.

— Дачка глядзіць спектаклі з Вашым удзелам?

— Не толькі глядзіць, а і ведае ўсе мае ролі. І больш за ўсё, як не дзіўна, ёй падабаецца Чорт. Яна нават марыць стаць артысткай.

— А Вы хочаце, каб Ваша дачка стала артысткай?

— Цяжка сказаць.Я, як і мая мама, перашкаджаць не буду. Кім хоча, тым няхай і будзе. Але мне сёння вельмі шкада тых людзей, якія выбралі ці хочуць выбраць прафесію акцёра і жыць на жабрацкую зарплату. Я ледзь-ледзь зводжу канцы з канцамі. Гэта проста жах.

— Ці падабаюцца Вам слонімскія гледачы?


— Гледачы цяпер сталі сур'ёзна разбірацца ў тэатральным мастацтве. Яны бачаць і адчуваюць фальш на сцэне, добрую ігру акцёраў. Гледача цяпер не падманеш. Так яно і павінна быць. А слонімскія гледачы заўсёды цёпла і шчыра прымалі і прымаюць нашы спектаклі. Дзякуй ім за гэта!

Сяргей ЧЫГРЫН

НАЙБОЛЬШ ЧЫТАЮЦЬ "ЗДАРОЎЕ", "БУРДУ" І "СЯЛЯНКУ"

Слонімскай цэнтральнай раённай бібліятэцы на падпіску на першы квартал 2002 года было выдаткавана тры мільёны трыста тысяч рублёў.

Гэтых грошай хапіла, каб выпісаць 110 перыядычных выданняў (у бягучым годзе – 131 назва). З іх 64 беларускія выданні і 42 – расійскія. 70 газет і часопісаў застанецца ў Цэнтральнай бібліятэцы, у сярэднім па 35 назваў прыпадае на гарадскія бібліятэкі і па 13 – на вясковыя.



Фота Віталя ГІЛЯ

Як адзначала дырэктар цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Ларыса Рэпінская, найбольшым попытам у чытача карыстаюцца такія выданні як "Здароўе", "Бурда", "Сялянка", "Гаспадыня", "Ксюша", "Бярозка" і іншыя. З літаратурных часопісаў чытаюць "Сусветную літаратуру", "Нёман", "Маладосць", а вось "Полымя" – старэйшы і самы ёмісты часопіс беларускіх пісьменнікаў – не быў запатрабаваны ні разу, і на будучы год яго не выпісалі.

У 2001 годзе ў памяшканні Цэнтральнай раённай бібліятэкі быў зроблены рамонт, на што, па словах Ларысы Рэпінскай, былі патрачаны асноўныя бюджэтныя сродкі. Таму кніжны фонд папоўніўся ў гэтым годзе толькі 135 асобнікамі кнігі Аляксея Якімовіча "Залатая дзіда". Для параўнання, у мінулым годзе на сродкі мясцовага бюджэту цэнтралізавана было закуплена 2120 кніг.

Мікола КАНАНОВІЧ

ЗДАРЭННІ

ПОГИБЛИ ОТ НАЕЗДА

На прошлой неделе, на ул. Красноармейской водитель автомобиля VW-транспортер, отвлекшись от управления машиной, наехал на двух пешеходов.

От полученных телесных повреждений 23-летняя девушка и 26-летний юноша (студенты Минской духовной семинарии) скончались.

Водитель, совершивший наезд, задержан.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ВОРОВАЛИ ПОСЛЕДНИЕ ДЕНЬГИ

На днях милиция задержала группу цыган, которые воровали деньги у жителей деревень Слонимского района.

В общей сложности, как считают работники местного отдела внутренних дел, цыгане обворовали более 5 семей из деревень Особняки, Забулье, Гловсевичи, Заверщье.

Ольга ШИНКЕВИЧ

МУЖЧИНА ПОГИБ В ОГНЕ

В Слониме 14 декабря, в пятницу, на ул. Шоссейной загорелся частный жилой дом.

В огне погиб 62-летний хозяин дома. Причина пожара устанавливается.

Ольга ШИНКЕВИЧ

СГОРЕЛ НАВЕС

В д. Новодевятковичи Слонимского района в одном из подворий вспыхнул дощатый навес для хранения сена.

Предварительная причина пожара – неосторожное обращение с огнем.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ПЕЧКА НАДЕЛАЛА БЕДЫ

В прошедшую субботу в деревне Шундры Слонимского района местные жители увидели, как загорелся один из домов. На место происшествия прибыли пожарные.

64-летний хозяин дома не пострадал. Причина возгорания – неисправная печь.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ОГОНЬ ПОВРЕДИЛ БАНЮ

В воскресенье, 16 декабря, в Слониме по ул. Котовского загорелась частная баня.

38-летняя хозяйка, которая в то время находилась в помещении, не пострадала. Причина пожара устанавливается.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ОБГОРЕЛИ ПЯТКИ

В результате неосторожного обращения с огнем загорелся жилой дом по ул. Подлесной, что в Слониме.

73-летний хозяин дома отделался небольшим ожогом пяток.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗАБІЎ КАХАНУЮ

На мінулым тыдні ў вёсцы Ісаевічы Слонімскага раёна ад шматлікіх ранаў памерла 45-гадовая мясцовая жыхарка.

Высветлілася, што забіў жанчыну яе 34-гадовы сужыцель. Падчас распіцця спіртных напояў яны нешта не падзялілі. У выніку мужчына пачаў збіваць каханую, а потым нанес некалькі ўдараў нажом. Выратаваць жыццё жанчыны дактары ўжо не змаглі, яна памерла на месцы.

Валодзя ЯНЧУК

"ФАЛЬШИВКА" В ВЫТРЕЗВИТЕЛЕ

У доставленного в Слонимский медвытрезвитель парня в кармане была обнаружена поддельная 100-долларовая купюра.

Внятно объяснить её происхождение задержанный так и не смог...

"ГП"

ГРОДНО

РЕДАКТОРА «ПАГОНІ» ОШТРАФОВАЛИ НА ПОЛМИЛЛИОНА РУБЛЕЙ

В суде Ленинского района Гродно вынесено решение об административном наказании главного редактора закрытой негосударственной газеты "Пагоня" Николая Маркевича.

Судья Дмитрий Демченко посчитал редактора участником несанкционированного пикета, который состоялся в Гродно 19 ноября и был организован в защиту "Пагоні", закрытой по решению Высшего хозяйственного суда Беларуси. Маркевич обвинен в правонарушении, предусмотренном статьей 167-1, частью 1, Кодекса об административных правонарушениях Республики Беларусь, и подвергнут штрафу в размере 50 минимальных зарплат.

Геннадий БАРБАРИЧ

МАСТЫ

ЗЛАЧЫННАСЦЬ УЗРАСТАЕ

Як паведаміў намеснік начальніка Мастоўскага РАУС Віктар Пяцэвіч, за гэты год, у параўнанні з мінулым, злачыннасць узрасла на 13%.

Расце, як па лініі крымінальнага вышуку, групавых злачынстваў, так і злачынстваў, учыненых непаўналетнімі. Найбольш крадуць маёмасць, часцей — прадукты харчавання. Іх крадуць з прыватных дамоў, гаражоў ды прыбудоў. У бягучым годзе ўчынена таксама сем крадзяжоў з сельскіх і чатыры з гарадскіх крамаў. Таксама зарэгістравана дзевяць асабліва цяжкіх злачынстваў, з іх тры не раскрыты.

Язэп ПАЛУБЯТКА

"ДЗЕЯЧАС" ВЫХОДЗІЦЬ У ЧАС

Мастоўскі пісьменнік Лявон Вашко выпусціў чарговы нумар літаратурнага агляду "Дзеячас".

Гэта дзевятая кніжка ад пачатку выдання і другая ў гэтым годзе. У ёй выдавец распавядае свае бачанне моваўтварэння, падае апошнія навіны, дае анатацыі на выданні апошняга часу. Тут таксама змешчаны вершы Ілоны Сцяцко. Напярэдадні Новага года пабачыць свет яшчэ адзін нумар. Ён, як і яго папярэднік, будзе мець шаснаццаць старонак.

Язэп ПАЛУБЯТКА

НАЧНАЯ КРАМА

У Мастах стала працаваць начная крама.

Яна адкрылася на месцы былой кулінарыі і працуе кругласутачна з невялікім перапынкам ноччу з 3 да 5 гадзін.

Язэп ПАЛУБЯТКА

"ПАДАРУНАК" "СВАБОДНАМУ ПРАФСАЮЗУ"

Кіраўніцтва Мастоўскага прадпрыемства "Самана Плюс" па-свойму выказала адносіны да сяброў "Свабоднага прафсаюза".

Начальства афіцыйна заявіла, што іх дзеці не атрымаюць навагодніх падарункаў ад адміністрацыі.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЗАБАРАНІЛІ ПРАДАВАЦЬ ПЕТАРДЫ

Згодна рашэнню Мастоўскага райвыканкама з 14 снежня ў крамах горада і раёна забаронены продаж петард.

Празнаўшы пра гэта, дзеці загадзя скупілі ўсю піратэхніку, якая прадавалася ў прыватных крамах.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ЗЭЛЬВА

... А КАМУ ДУЛЯ З МАКАМ

Іван ЦІМАФЕЙЧЫК

Адным з прыярытэтных накірункаў у дзейнасці беларускай міліцыі ў новым годзе стане далейшае выяўленне і папярэджанне буйных злачынстваў у эканамічнай сферы. Пра гэта ў інтэрв'ю "Інтэрфаксу" заявіў міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімір Навумаў.



Л. У. Эльяшэвіч

Я, як просты грамадзянін краіны, цалкам згодны з міністрам, што пара сапраўды навесці парадак у гэтым накірунку. Бо людзям ужо абрыдла бачыць, як начальства той жа Зэльвы вырабляе што хоча за грошы, якія яны аддалі на падаткі. Прыкладам, старшыня Зэльвенскага райвыканкама В. І. Будрэвіч (цяпер ужо былы) і яго пераемнік Л.У.Эльяшэвіч за кароткі тэрмін адбудавалі сабе неблагія катэджы. Першаму пабудавалі дом па вул. Шапавалава, 35; другому – па вул. 17 Верасня, 57.

А ці патрэбна было ўзводзіць на людскія грошы яшчэ адзін старшынскі асабняк, калі ўжо такі службовы быў раней узведзены? Мусіць тое жыллё проста павінна было перадацца, як у былыя часы, згодна службовай ракіроўцы. Скажам, ад Будрэвіча – Эльяшэвічу. Тым самым людскія грошы, патрачаныя на будаўніцтва новай хаты для начальства, маглі б быць патрачаны на ўвод іншых грамадскіх аб'ектаў. Скажам, на той жа доўгабуд-паліклініку, ці доўгабуд-хлебапякарню.

Калі, напрыклад, прасачыць ход адбудовы асабняка для В. І. Будрэвіча, дык гэта не вытрымлівае ніякай крытыкі. Стаў "вертыкальшчыкам", дом жылой плошчай 89 кв.м у в. Старое Сяло (10 км ад Зэльвы) зараз жа падараваў дочцы і тымчасна сам застаецца бяздомным. Гэта нібы стала падставай пабудовы для яго асабняка ў Зэльве. Услед распачалі ўзводзіцца два двухпавярховыя асабнякі-блізняты па вул. Першамайскай. Абураныя зэльвянчане шлюць пісьмы-скаргі ў Кантрольную палату РБ. Адзін з гэтых дамоў-гмахаў узводзіцца для былога начальніка РАУС С.І.Максімава. Другі, так званы райвыканкамаўскі, – "замарожваецца". Пасля чаго райвыканкам, якім камандаваў В.І.Будрэвіч, робіць другі кідок і выкупляе дом па вул. Шапавалава. Пазней, пасля яго адбудовы (пад выглядам рэканструкцыі) усяляецца ў яго бяздомны В.І.Будрэвіч. Значыцца, гэты начальнік ўмела выкарыстаў момант прызначэнцтва-"вертыкальшчыка". Дом жа ў вёсцы Старое Сяло, небывала вялікай агульнай плошчы, асірацела стаіць. А тымчасна шмат люду ў Зэльве не могуць з году ў год палепшыць свае жыллёвыя ўмовы.

А чаму б асабняк па вуліцы Шапавалава,35 не перадаць Л.У.Эльяшэвічу? І адпала б неабходнасць у стварэнні шэрагу старшынскіх асабнякоў. Як бачна, з ланцужка адбудоў поўнасцю выпадае небывала дарагі дом па вуліцы 17 Верасня, 57. А за гэтыя сродкі, бадай што, была б закончана забудова дома культуры ў в. Князева Зэльвенскага раёна, які васьвось рухне, не прыняўшы на сцэну ніводнага артыста.

Тымчасна Л.У. Эльяшэвіч жыве ў новаадбудаваным асабняку, які атрымаў даволі хутка і пазачаргова... Усяленне вялося, так сказаць, паэтапна – каб не было асабліва нараканняў з боку зэльвянцаў. Аднак, працягваюць прыпыняцца ля гэтага дома машыны тыпу "лятучак" з будаўнікамі і рамонтнікамі для паляпшэння ўмоў быту гаспадара. Але да якога часу гэта будзе працягвацца? Ці не пара прыпыніцца і кінуць погляд на іншыя недабудаваныя і патрабуючыя аднаўлення аб'екты?

І вось з пісьмом ад 10 верасня 2001 года я звярнуўся ў Рэспубліканскі Дзяржкантроль. Маўляў, разбярыцеся з гэтымі стасункамі, якія парадкам абрыдлі Зэльвеншчыне. Мой ліст спіхнулі ў Гродзенскі аблвыканкам. Словам, туды, дзе "заварвалася" усё гэта "варыва". Так што, знаючы іх "кухню", чагосьці лепшага не прыходзілася і чакаць. І вось паперай за №322 ад 18.10.2001г. за подпісам загадчыка аддзела будаўніцтва, тэрытарыяльнага развіцця і энергетыкі Л.Л.Вяндзілоўскага я атрымаў адказ, што, маўляў, В.І.Будрэвіч ужо дасягнуў пенсійнага ўзросту (у жніўні месяцы 2000 года) і не можа, у сувязі з гэтым, быць выселеным са службовага (старшынскага) асабняка. Вось так! Дачакаліся... Адпісаўся – і справе канец. Пішыце далей. Знаёмы прынцып: "А Васька слухае, ды есць..."

Зазначу, дзесьці ў студзені-лютым 2000 года В.І.Будрэвіч страціў пасаду старшыні райвыканкама. З 11.02. 2000г. на гэтай пасадзе з'явіўся Л.У.Эльяшэвіч. І толькі ў жніўні месяцы 2000 года В.І.Будрэвіч трапіў на пенсію (больш як праз паўгода). Значыцца, чаму ж пасля звальнення В.І.Будрэвіча з гэтай пасады так і не выкарысталі магчымасць высялення яго са "старшынскага" службовага асабняка? Што тут не спрацавала? Ці прагледзелі? Ці, можа, спрацаваў той жа прынцып, як "прызначэнца" і ўладара, уладкаваць свой быт выгадней і зручней? І, здаецца, Л.У.Эльяшэвіч "перагнаў" апошняга, "пераплюнуў" яго. Нічога, што сродкі вялікія ўгроханы. Гэта ж не свае, а дзяржаўныя. А намеснік старшыні райвыканкама па будаўніцтву М. І. Януль тлумачыць – "аблвыканкамаўскія". А аблвыканкам дзе іх узяў? Вядома ж з ліку падаткаў. А можа таму ў Гродне чыноўнікі зарабляюць грошы на копцы бульбы і такім чынам будуюць сваім калегам хаты? Маўляў, прыедзе новы старшыня -"вертыкальшчык", і яму асабняк адбудуем. Дык ці не пара ў г.п. Зэльва адбудоўваць новую, так званую, вуліцу Старшынскую?

Цяпер на вуліцы 17 Верасня ў накірунку старшынскага асабняка кладуць новую тратуарную сцежку. Тым часам, як на іншых вуліцах робяць толькі "ямачны" рамонт. А пасля па тых нельга ні хадзіць, ні ездзіць. Невыпадкова, што люд ужо навучыўся параўноўваць і аналізаваць. Заўважу, некалі В.І.Будрэвіч ездзіў у вёску Старое Сяло і назад, калі быў старшынёй райвыканкама, дык адразу тую дарогу заасфальтавалі. Пасяліўся Л.І.Эльяшэвіч па вуліцы 17 Верасня – і цэнтр Зэльвы перамясціўся ў накірунку, дзе ён жыве. Мясцовае начальства кажа, што ўсё робіцца па плану. Калі хто ж гэтыя планы стварае, калі не само начальства. Не паехаў жа ім сам Аляксандр Лукашэнка планаваць Зэльву. Узнікае пытанне: ці не прыдзецца ўсяму раёну гадамі працаваць на старшынскія асабнякі? Дык ці не пара законнікам даглядзець асабнякі пад начальства, а тэрміновы заняцца завяршэннем шматлікіх доўгабудаў у самой Зэльве і на Зэльвеншчыне, якія ўжо рушацца з-за другараднасці, нядбайнасці і безгаспадарчасці? Яны ўжо сталі сумным "помнікам-напамінам" як не трэба працаваць. Чаму б тады не арганізоўваць экскурсіі маладога пакалення з мэтай паказу бяздарнасці і абыякавасці цяперашняга кіраўніцтва на хлебазавод, піўзавод, цагляны завод, мясаперапрацоўчы цэх на жывёлагадоўчым комплексе "Бародзічы" і інш? Уявіце, гэтым летам пампезна праводзіўся ў райцэнтры так званы "Аннenскі кірмаш", а ў абноўленай Зэльве не знайшлося грамадскай прыбіральні. І гэта гаворка ідзе пра цэнтр Зэльвы, не гаворачы ўжо пра ўскрайкі. Вось якое яно "добраўпарадкаванне"!

Васьмікватэрны настаўніцкі дом у в.Мадзейкі, у якім я пражываю, быў здадзены ў эксплуатацыю ў далёкім 1966 годзе. З таго часу капітальным рамонтам яго ніхто не займаўся. У многіх месцах яго працякае дах. А дом знаходзіцца на балансе райвыканкама. Вядома, там жыве не "мясцовая эліта", а "прасталюдзіны", якія пацерпяць і пераб'юцца.

Вось і атрымоўваецца: для каго – "добраўпарадкаванне", каму – "ямачны рамонт", а каму... – не інакш як дуля з макам.

3 лістапада 2001 г.

МАСТОЎСКІ КАСЦЁЛ

Мінулай восенню ля мастоўскага касцёла была пастаўлена скульптурная кампазіцыя Ісуса Хрыста, які нясе свой пакутніцкі крыж. Гэта нейкім чынам увасабляе шлях збудавання каталіцкага храма ў гэтым мястэчку, якое было ўтворана напрыканцы 20-х гадоў мінулага стагоддзя на месцы зліцця рэк Зэльвянка і Нёман. Пабудаваная тут дыхтавая фабрыка паклала пачатак новаму паселішчу, якое мела назву Масты Фабрычныя. Новастворанае мястэчка не мела сваіх культавых устаноў. Толькі падчас гарбачоўскай перабудовы знайшліся прыхільнікі веры, якія распачалі будаваць храмы. Каталікі напачатку 90-х гадоў пабудавалі капліцу ды, як належыць, устанавілі крыж. Касцёл будавалі грамадой. І толькі праз дзесяць гадоў, у жніўні 2000 года ў касцёле распачалі служыць Богу.

Язэп ПАЛУБЯТКА



Фота Віталя ГІЛЯ

Скульптурная кампазіцыя Ісуса Хрыста

ВАЎКАВЫСК

ВІННЫ БАРТЭР

У краму вёскі Данілаўцы, што знаходзіцца ў Ваўкавыскім раёне Рoсскага сельсавета, мясцовы калгас "Савецкая Беларусь" завёз таннае віно , якое атрымаў па бартэру.

Адна бутэлька віна каштуе 600 рублёў, але купіць яго могуць толькі калгаснікі і толькі пасля 17 гадзін. А ўжо з 16 гадзін там утвараецца вялікая чарга.

Антон МАКЕЙ

ШЧУЧЫН

МАБІЛЬНЫХ ТЭЛЕФОНАЎ ПАБОЛЬШАЕ

У Шчучыне ў хуткім часе пачне працаваць станцыя "сотавай сувязі".

З яе ўводам пасажыры аўтатрасы Мінск-Гродна будуць мець амаль бесперабойную сувязь з іншымі абанентамі.

Антон МАКЕЙ

ЛІДА

"ТЭЛЕСКОП" У ЛІДЗЕ

У Лідзе распачаўся выхад штотыднёвіка "Тэлескоп", які распавядае пра падзеі горада і раёна, гісторыю краю, пра сённяшнюю сітуацыю ў гэтай мясцовасці.

Гэта чацвёртае выданне ў рэгіёне, і таму, як лічаць ініцыятар выдання мясцовы паэт і рэдактар рэспубліканскай газеты "Наша слова" Станіслаў Суднік, даводзецца папрацаваць, каб займець свайго чытача. Першапачатковы наклад штотыднёвіка 2000 асобнікаў.

Язэп ПАЛУБЯТКА

БЕРЕСТОВИЦА

ЦЕРКОВНЫЕ РЕПРЕССИИ

«За раскольническую деятельность» настоятель Крестовоздвиженской церкви в деревне Клепачи Берестовицкого района Ян Спасюк лишен сана священника Русской православной церкви.

Такое решение принято на общем собрании духовенства Гродненской епархии.

"Наша Свабода"

ДЗЯТЛАВА

ЗАГІНУЎ ПАД КОЛАМІ "МЕРСЕДЭСА"

7снежня пад коламі аўтамабіля "Мерседэс-Бэнц" загінуў 45-гадовы ляснік Вензавецкага лясніцтва Дзятлаўскага раёна Уладзімір Лунь.

У 18 гадзін мужчына вяртаўся на веласіпедзе дамоў у Дзятлава. Каля вёскі Хадзяўляны яго падбіў аўтамабіль і знік. Міліцыя шукае забойцу.

Сяргей ЧЫГРЫН

МАСТЫ

ГОРКІ ЦУКАР

41-гадовы жыхар Мастоў, які нідзе не працуе, абрабаваў унітарнае сельгаспрадпрыемства "Мастаўчанка".

Ноччу ён адкрыў люк бункера і залез у склад. Адтуль злодзей украў 348 кг цукру на агульную суму 225 тысяч рублёў. Але цукар для яго аказаўся горкім , бо супраць рабаўніка ўзбудзілі крымінальную справу.

Сяргей ЧЫГРЫН

Газета Слонімская
20 — 26 снежня 2001г. №51 (237)

ОДИН РАЗ В ГОД

Отныне в Беларуси ревизия и плановая проверка одного и того же субъекта хозяйствования может осуществляться не более одного раза в год.

Такова суть изменений и дополнений, которые внесены указом президента в Порядок организации и проведения проверок (ревизий) финансово-хозяйственной деятельности и применения экономических санкций.

В официальном комментарии к указу отмечается, что такая мера предпринята во исполнение одного из положений предвыборной программы президента А.Лукашенко, где в качестве одной из основных социально-экономических гарантий определено осуществление контроля производственных предприятий и фирм 1 раз в год, а других предприятий — 2 раза в год.

Вместе с тем Порядок предусматривает и проведение внеплановых проверок (ревизий) одного и того же субъекта предпринимательской деятельности. Они могут проводиться только по поручению президента, Совета Министров, Комитета государственного контроля, Совета по координации контрольной деятельности, налоговых, правоохранительных и судебных органов, за исключением встречных проверок. Порядок проведения и организации проверок также предусматривает, что экономические санкции налагаются уполномоченными контролирующими органами с учетом финансового состояния нарушителя, размера причиненного вреда и характера допущенных нарушений. К субъекту предпринимательской деятельности не могут быть применены экономические санкции, если истекли два года со дня совершения правонарушения и три месяца со дня обнаружения нарушения. Правда, это не распространяется на случаи применения экономических санкций за нарушения налогового, таможенного и бюджетного законодательства.

Обязательным условием применений экономических санкций является наличие установленных и описанных в акте проверки (ревизии) фактов нарушения субъектом предпринимательской деятельности конкретных предписаний актов законодательства, регулирующих экономические отношения и предусматривающих экономическую ответственность за данный вид правонарушения.

Алексей ОРЕШКО

БУДЕТ УПРАВЛЕНИЕ МОРАЛЬНОГО ОБЕСПЕЧЕНИЯ

"В соответствии с планом завершения реформирования Вооруженных сил Беларуси нами подготовлена концепция морально-психологического обеспечения жизнедеятельности войск, — заявил в интервью БелаПАН начальник управления воспитательной работы и информации Министерства обороны полковник Владимир Сероштан. — Мы, в частности, предложили преобразовать управление воспитательной работы и информации в управление морально-психологического обеспечения войск".

Вновь создаваемое управление будет заниматься вопросами анализа и оценки, прогнозирования морально-психологического состояния войск, вопросами организации и проведения воспитательной работы в Вооруженных силах (ВС), организационного обеспечения деятельности ВС, информированием общества о жизни и деятельности ВС через средства массовой информации, вопросами культурного обслуживания ВС, духовно-нравственным воспитанием личного состава. Кроме того, по плану завершения реформирования ВС управление по увековечению памяти погибших воинов будет преобразовано в отдел по увековечению памяти погибших в составе создаваемого управления морально-психологического обеспечения. "Таким образом, вновь создаваемое управление будет отвечать за вопросы патриотического воспитания в полном объеме", — сказал Владимир Сероштан.

Юрий КАСЬЯНОВ

У КАЖДОГО СВОЕ МНЕНИЕ

Александр Лукашенко будет добиваться продления президентских полномочий на третий срок.

Такого мнения придерживается 82 процента лидеров общественного мнения и экспертов, представляющих примерно поровну государственные и негосударственные организации.

В ходе опроса, проведенного в ноябре сотрудниками Независимого института социально-экономических и политических исследований, было опрошено более 70 человек. Противоположного мнения придерживается 1 процент респондентов. Остальные (17 процентов) воздержались от ответа на предложенный вопрос.

При этом около трети опрошенных — 34 процента — считают, что номенклатура поддержит эту инициативу Лукашенко. 32 процента придерживаются противоположного мнения. И 34 процента экспертов затруднились ответить на вопрос "Поддержит ли номенклатура эту инициативу А.Лукашенко?"

По мнению 44 процентов респондентов инициативу А.Лукашенко о продлении на третий срок своих полномочий поддержит и население республики. 34 процента придерживаются противоположной точки зрения. И 22 процента опрошенных затруднились оценить возможную реакцию жителей Беларуси на инициативу нынешнего президента республики.

БелаПАН

НОВАЯ ЛЬГОТА ДЛЯ ИНВАЛИДОВ ВОЙНЫ

Конституционный суд (КС) Беларуси принял решение, согласно которому льгота при уплате обязательных страховых взносов на строения должна предоставляться инвалидам Великой Отечественной войны и тогда, когда строение находится в совместной собственности инвалида и его супруги.

Решение КС принято в ответ на обращение Любанского районного совета Белорусского объединения ветеранов.

Как показывает практика, в тех случаях, когда строение зарегистрировано на имя супруги инвалида, льгота по обязательному страхованию строений не предоставляется.

Между тем, по мнению КС, декрет президента от 8 октября 1997 года предусмотрел освобождение от уплаты страховых взносов инвалидов Великой Отечественной войны во всех случаях.

Юрий КАСЬЯНОВ

ПОСТРАДАЛИ ОТ ПЕРЕОХЛАЖДЕНИЯ

В период с 7 по 14 декабря в Беларуси от переохлаждения пострадало около 140 человек.

Как сообщил БелаПАН главный врач Минской городской станции скорой помощи Виталий Фетишин, в Минске, в частности, за аналогичный период из-за переохлаждения в городских больницах оказались 19 человек. Он отметил, что пострадавшие были доставлены в отделения приемного покоя с диагнозами "переохлаждение" и "обморожение конечностей". Причем большинство из них находилось в состоянии алкогольного опьянения.

По словам медика, за этот период летальных исходов по республике зафиксировано не было.

Напомним, что в последние две недели в Беларуси сохранялась низкая температура, которая в разные дни и в разных районах Беларуси колебалась от 5 до 22 градусов мороза.

Ольга ОСИПЕНКО

ТАРИФ НА ПРОЕЗД УВЕЛИЧИТСЯ В ТРИ РАЗА

Транспортные организации белорусской столицы предполагают в будущем году выйти на 50-процентную окупаемость.

Жаніх быў высокі, статны, з добрымі, не вясковымі манерамі. Ведаў, калі што сказаць, калі трэба прамаўчаць. За чарку асабліва не хапаўся: толькі прыгубіць крыху і зноў паставіць на стол. Мне гэта спадабалася. Голас у яго быў ціхі, роўны, гаворка разумная. Казаў, што ў свой час закончыў аўтадарожны тэхнікум, працаваў у абласным цэнтры. Але, калі памёр бацька і маці зусім занемагла, вярнуўся ў вёску. Трымалі карову, свіней, курэй. І ўся гэта гаспадарка, уласна кажучы, была на яго руках, бо маці з палачкай ледзь магла прайсці праз хату. Як не круці, а Сяргею трэба было жаніцца.

Вяселля мы не рабілі, хаця Сяргей і мая мама вельмі настойлівалі на гэтым. Але я была супраць: не васемнаццаць, нябось, каб у вэлюме красавацца. У маіх равесніц ужо дзеці ў школу ходзяць, дык навошта людзей смяшыць.

Жыла я ў шлюбе без кахання, але нядрэнна жыла. Муж быў і сапраўды працавіты, уважлівы, стараўся, каб у хаце было ўсё неабходнае. Ды і маці яго, кабета рахманая і лагодная, прыняла мяне як родную дачку. Рада была, што ёсць каму і ў печы выпаліць, і бялізну памыць, бо па гаспадарцы Сяргей упраўляўся сам. Калі я іншы раз брала вядро, каб падаіць карову, то мякка прарэчыў:

— Адпачні. Табе і ў школе клопатаў хапае.

У першы вясновы месяц, калі з-пад снегу пачалі з'яўляцца праталіны, я зразумела, што неўзабаве стану мамай. Увесь свет перайначыўся ў маіх вачах. Здавалася, і сонейка стала свяціць ярчэй, і птушкі ў голым алешніку загаманілі весялей. Наша хата стаяла апошняй у вёсцы, і адразу за сядзібай рос густы алешнік уперамешку з іншым кустоўем. Меліярацыя яшчэ сюды не дабралася, і прырода стаяла ў сваёй першароднай прыгажосці. За гэтым алешнікам праз голыя кусты быў відаць хутар, да якога ад нашай сядзібы вяла вузенькая сцежка. Я ведала, што там адзінока жыў сталы чалавек гадоў пяцідзесяці, ад якога яшчэ ў маладосці збегла жонка з маленькім сынам. А ён так і застаўся каратаць век у адзіноце, ні разу не спрабаваў завесці новую сям'ю. Усё гэта я чула ад свякроўкі, а самога суседа яшчэ ні разу не бачыла.

Сустрэцца нам давялося ў канцы красавіка. Антону Бабрукевічу, так звалі нашага суседа, брыгадзір даў каня пасадзіць пры хаце бульбу, і ён прыйшоў да нас папрасіць падмогі. Я якраз мела выхадны і паласкала ля калодзежа бялізну. Стукнулі веснічкі. Падняла галаву і ўбачыла, што па сцежцы да дому ідзе мужчына сярэдняга росту з чыста паголеным прыгожым тварам. Ён быў апрануты ў фуфайку і гумовыя боты — уніформу ўсіх вясковых мужчын, чыя работа звязана з сельскай гаспадаркай, а Антон, як і мой муж, быў шафёрам.

— Добры дзень, суседачка, — прыязна павітаўся ён. — Бачу, што не ў час прыйшоў, што ў вас і сваёй работы хапае, але вельмі прашу: дапамажыце пасадзіць бульбу. Работы няшмат, бо маю пры хаце ўсяго пяць сотак, але ж адзін не ўпраўлюся кідаць насенне ў барозны.

У поглядзе яго была такая цеплыня, у голасе — пяшчота і ласка, што на душы ў мяне стала неяк асабліва светла і хораша.

— Абавязкова дапамагу, не турбуйцеся, — паспяшалася я абнадзеіць суседа. — Тым больш, што сваю работу ўжо закончыла: вось толькі павешу гэтыя дзве кашулі.

Конь у баразне хадзіў хутка. Ім кіраваў калгасны конюх дзед Міхась. А сваю справу ён ведаў добра. Так што мы з Антонам ледзь паспявалі кідаць бульбу ў барозны. А ён яшчэ сачыў, каб я сама не насыпала клубні з мяшка ў кошык: падбягаў, дапамагаў. І аднойчы, калі брала з яго рук поўны кошык, нашы позіркі сустрэліся. Некалькі кароткіх імгненняў ён глядзеў на мяне з такім замілаваннем і ласкай, што мае шчокі запылалі ад хвалявання.

Калі добра адскочыла маладая траўка, Антон ганяў на пашу сваю карову якраз каля нашай хаты. Цяпер мы сустракаліся часцей, і кожная такая сустрэча была для мяне найвялікшым святам. А ён... То падорыць букецік першых вясновых кветак, то пачастуе цукеркамі. Усё гэта было для мяне радасна і прыемна. У той жа час адчувала, што доўга так працягвацца не можа. Нехта ўбачыць, што гэты прыгожы і ласкавы чалавек з хутара ўдзяляе мне больш увагі, чым проста суседцы. І аднойчы, калі ён, гонячы на пашу карову, прынёс букецік духмяных ландышаў, я адмовілася ад падарунка.

— Што падумаюць людзі? — вымавіла такую недарэчную фразу, ад якой робіцца сорамна і цяпер.

Ён паціснуў плячыма, кінуў кветкі на траву і ціха прамовіў:

— Даруйце, я не хацеў вас пакрыўдзіць...

А ў канцы лета, калі ў нашым садзе ўжо наліліся чырванню яблыкі, муж прынёс навіну: Антон звольніўся з работы, прадаў карову і паедзе ў далёкі горад да сястры. Для мяне гэта была горкая вестка, бо ў апошні час толькі тым і жыла, што думала пра немаладога чалавека з хутара. Я зразумела, што нарэшце да мяне прыйшло каханне. Такое позняе і такое жаданае. Горкае, як палын пры дарозе, бо ўжо няшмат часу заставалася да таго дня, калі я павінна была нарадзіць сына. Ад мужа, якога ніколі не любіла...

Цяпер больш за ўсё баялася, што ён паедзе, не развітаўшыся са мной, і я ўжо ніколі не ўбачу яго чароўнай усмешкі, не пачую ціхага ласкавага голасу...

Але лёс падарыў мне яшчэ адну сустрэчу. Дакладней будзе сказаць, Антон падарыў. Калі я аднойчы вярталася з магазіна, ён сустрэў мяне на вясковай вуліцы і, павітаўшыся, падаў лісточак паперы.

— Бывайце назаўсёды, — сказаў з такім болем, што ў мяне на вачах выступілі слёзы. — Больш мы не сустрэнемся ніколі...

І пайшоў.

Дома, ціхенька, каб ніхто не ўбачыў, я разгарнула лісток і прачытала: "Даруйце за маё каханне. Я не магу жыць без вас і не магу жыць з вамі. Бывайце."

Больш мы не бачыліся ніколі. На першым часе я доўга пакутавала, без слёз не магла глядзець на сцежку, што вяла да яго адзінокага асірацелага хутара. Але час залячыў душэўную рану. У памяць аб сваім горкім каханні я назвала сына Антонам. Цяпер яму ўжо трыццаць чатыры гады.

З пашанай,
Людміла Валянцінаўна

НАШЫ ТАЛЕНТЫ

БОГ ДАЎ ТАЛЕНТ, АЛЕ ШЧАСЦЯ НЕ ДАЎ

Радасць не ўмяшчалася ў яе маленькім сэрцайку і, здавалася, запаланіла ўвесь хутар Макрэшчына, увесь свет: сёння тата прывёз з Дзятлава радыёлу і невялічкі стос пласцінак з песнямі Сібірскага народнага хору і Людмілы Зыкінай. Больш шчодрага падарунка для дзяўчынкі, якая так любіць музыку і песні, і прыдумаць нельга. За які тыдзень яна ўжо ведала на памяць усе песні любімай спявачкі і выводзіла іх сваім тоненькім звонкім галаскам.

На хутары Ала часта давала "сольныя" канцэрты для мясцовай дзятвы. Бывала, стане на цёплым, пакрытым зялёным велюрам моху камені, і спявае з такім натхненнем, такой асаладай, нібы салавейка ў ціхую майскую раніцу. Тады дзяўчынка ўяўляла сябе на сцэне і шчыра верыла, што прыйдзе той час, калі слухачамі будуць не хутарскія хлопчыкі і дзяўчынкі, што зачаравана не зводзілі з яе вачэй, а сур'ёзная і салідная публіка.

Яна спявала заўсёды і ўсюды: у лесе, дзе збірала ягады, у полі, пасучы кароў. А калі пайшла ў Таркачоўскую сярэднюю школу, што непадалёку ад іхняга хутара, то ўдзельнічала ва ўсіх канцэртах мастацкай самадзейнасці, выступала разам з дарослымі на раённай сцэне.

Пасля заканчэння васьмі класаў яна накіравалася з роднай Дзятлаўшчыны ў абласны цэнтр, каб паступіць у музычнае вучылішча. Але там дзяўчынку чакала расчараванне:

— Мы прымаем на вучобу толькі тых маладых людзей, якім споўнілася васемнаццаць гадоў. Так што едзь дадому, падрасці, і потым сустрэнемся зноў.

Яна закончыла сярэднюю школу і пайшла працаваць у Таркачоўскі сельскі клуб, з хваляваннем чакаючы таго часу, калі споўніцца васемнаццаць гадоў. Хутка Ала стала студэнткай Гродзенскага музычнага вучылішча па класу вакала. Пасля — праца ў Беларускім дзяржаўным Народным хоры імя Цітовіча, які ў той час узначальваў вялікі энтузіяст сваёй справы Міхаіл Паўлавіч Дрынеўскі. З цягам часу яны сустрэнуцца на конкурсе ў Гомелі, дзе Міхаіл Паўлавіч быў старшынёй журы. Пасля канцэрта ён падышоў да Алы Аўдзейчык і спытаў:

— Дзе вы навучыліся спяваць?!

— У вас, — пачулася ў адказ. Маэстра быў вельмі ўражаны.

У хоры працавалася цікава і добра, але ёй хацелася спяваць адной. Гэта была запаветная мара дзяўчынкі. І неўзабаве лёс падараваў удачу: Алу запрасілі працаваць у Чарнігаўскую філармонію, потым — у Разанскую.

— Аб'ехала з сольнымі канцэртамі амаль усе рэспублікі Савецкага Саюза, — успамінае Ала Паўлаўна.

А потым... Потым адзін за адным пасыпаліся ўдары лёсу: здрада, хваробы, беспрасветная і цяжкая, як восеньскі туман, адзінота. І тады спявачка зразумела, што Бог даў ёй голас, але шчасця не даў. Таго жаночага шчасця, якое даступна многім жанчынам, і якія, у некаторых выпадках, проста не заўважаюць і не цэняць яго. Яна адна выгадавала двое дзяцей. І дачка, і сын выраслі самастойнымі, добразычлівымі, шчырымі ў адносінах да людзей. Вераніка працуе малодшым інспектарам пажарна-выратавальнага атрада на Гродзенскім вытворчым аб'яднанні "Азот", вучыцца завочна ў ВНУ. Сын Саша — яшчэ школьнік.

Лёс вадзіў Алу Паўлаўну па розных мясцінах. Цяпер яна жыве ў пасёлку Гезгалы, працуе кіраўніком мастацкай самадзейнасці на Дзятлаўскім сыраробчым заводзе.

Дзякуючы стараннямі і майстэрству Алы Аўдзейчык, гэты мастацкі калектыў заслужыў высокае прызнанне не толькі ў раёне, але і ў вобласці. За сваю працу Ала Паўлаўна атрымала падзяку ад міністра культуры Рэспублікі Беларусь.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ



Кіраўнік мастацкай самадзейнасці Дзятлаўскага сыраробчага завода Ала Аўдзейчык

ВОСЕНЬСКІЯ замалёўкі

НА ДВАРЭ ПАХНЕ ВОСЕННЮ...



Марыя РАМАШКА

Усё пачынае жаўцець, халадзець, адлятаць. Такое адчуванне, што гэта ўсё перадаецца мне: усярэдзіне холадна, і нешта жаўцее ды чырванее з кожным днём усё мацней і мацней. У хвіліны, калі я найбольш востра адчуваю гэтую жаўцізну, хочацца куды-небудзь ад усіх схавацца... Можа я хачу збегчы ад турботаў? Не, ад настрою, які зараз ва ўсім.

Настрой адзінокасці і суму жоўціць маё нутро...

БЕЛАЕ НЕБА

Белае неба. Маленькі ветрык. Зялёнае і ўжо жоўтае лісце. Восень... Зноў сум.

Але нешта прыемнае ёсць на душы?.. А, успомніла — надзея. Яна трывала ўладкавалася ў знясіленым сэрцы. Надзея на спаўненне жадання...

А што, калі яна не спраўдзіцца? Будзе зноў пуста ў сэрцы. Можа, знішчыць надзею? Запоўніць сэрца думкамі аб іншым?.. Але як гэта? Думкі, яны не ў сэрцы, яны ў галаве. Таму прыходзіцца згаджацца на існаванне надзеі.

...Лісце на дрэвах шавеліцца. Ціхенька, але прыкметна — прадказальна. А я не магу зразумець: сумна ці з надзеяй?..

А ШТО ЗАРАЗ?

— Як? Табе не сумна?

— Не, я захапляюся хараством прыроды. Паглядзі, якое чыстае блакітнае неба. Гэтая крыху марозная раніца падбадзёрвае!

— Але ж тваё сонейка адвярнулася ад цябе!

— Няхай так. Маё сонейка знайшло недзе няўпэўненасць. Хай пабадзяецца, паглядзіць на іншых. Я ведаю: яно вернецца да мяне. А пройдзе каляровая, багатая на разважанні аб залатым ды чырвоным восень, пройдзе чорна-белая зіма, і маё сонца зноў пагладзіць на мяне, усміхнецца і абагрэе!

— А што зараз?

— Чаканне...

БРУД

Цімур КУЦ

Квадратны пакой. Забітыя дзверы і вокны. На акне высахлая кроў, на дзвярах — свежая. У вуглу я — нямыты, нячэсаны. У супрацьлеглым — заванітаваная здохлая мыш. Побач — уласнае дзярмо з мухамі. Дыван зацвіў ад мачы, з лямпачкі звісае адзінокая сапля. А мне падабаецца! Напэўна, я настолькі прывык да гэтага, што па-іншаму і памерці не змагу.

Ты назавеш гэта брудам? Не, не будзь так упэўнена. Гэта ты купаешся ў брудзе, а мне ўжо абыякава.

Ты здохнеш не так, як я, таму што ты — не я. Таму, што ты ніколі не была ў маім свеце, ты не зразумееш прычыны.

Усё. Раблю апошні ўдых (уяві сабе, як я ўсміхаюся). Выдых. Бывай...

МЯНЕ ЧАКАЮЦЬ...

Расплюшчваю вочы. Белае. Гэта столь. А вакол усё такое знаёмае. Рознакаляровае. Нават пах. Ва ўсім ёсць нешта маё — ад мяне і для мяне.

Салодка пацягваюся. Чаму гадзіннік ходзіць толькі ўперад? Напэўна, таму, што кожная секунда — адзіная і вельмі хуткая. І відавочна не квадратная, каб спыніцца.

Не буду ўставаць. Не хачу прачынацца. Ложак такі мяккі і цёплы, а я такі халодны, што здаецца, нібы ў ім быў хтосьці яшчэ. А быў! Хтосьці... І знік. Кудысьці...

Ну навошта ўзыходзіць сонца? Яно шкодзіць фантазіі. Свет прабіваецца нават у заплюшчаныя вочы. І яго не выключыш...

Мяне чакаюць справы! Ілюзіі. Нішто і ніхто мяне не чакае. Мяне няма. Пажадайце мне добрай ночы...



Іван ЦІМАФЕЙЧЫК

Мае чароўныя рамонкі-васількі...

На золачку ў вішнёвенькім садочку
я палюбіла Васілёчка-Васілька.

Калі світанак кіне
яркі промень новы
на пагасаючую зараньку-зару,
пайду сцяжынкаю
у поле — збажынаю,
квяцістых зёлачак
на шчасце набяру.
Няхай раслі
ўдалечыні ад воднай плыні,
няхай не бачылі вірлівае ракі —
яны загадкавасць
нябёсаў ясна-сініх,
мае чароўныя рамонкі-
васількі.

Ах, вы,
мае вандроўнікі-прышэльцы,
спагадна узгадайце,
як мне быць,
чым супакоіцца маё
дзявочае сэрца —
каго мне адхінуць, каго любіць.

Надыдзе час мой:
заіскраць крынічкі-вочкі,
і сум пакіне
спахмурнелы чорны бровы,
а незабыўныя
рамонкі-васілёчкі
хай шчодра сыплюць мне
пялёстачкі любові.
Зайграюць радасцю
мігалачкі-павекі,
і губы-бантікі,
успыхнуць спелай вішняй,
калі табою зачараваная навек я,
знайду пялёстачкі
"да сэрцайка прыцісне".

Бы зорачкі
рассыпаны край жыта...
Мой лёс, мае рамонкі-васількі!
Скажыце, зёлачкі,
ўсю праўду раскажыце.
Гамоняць хай пялёсткі-язычкі!
Гадаю: любіць, любіць, любіць!



Янка КАРПОВІЧ

Бацькоўскі парог

Свеціць ласкавым знакам
Далеч дзён і гадоў,
І бацькоўская хата,
Мілы клёкат буслоў.
Я не ведаю, дружа,
Што мне вырашыць лёс,
А пад ранне падушка
Уся макрэе ад слёз.
Ты са мною, Радзіма,
Мой бацькоўскі парог,
Застанешся адзінай
Паміж многіх дарог.

Толькі з табою

Светлай памяці жонкі Ірыны
Антонаўны

Самотна па роднай, адной...
Не трэба чужой мне спагады,
Таемна заўсёды з табой,
Чакаю з надзеяй парады.
Шчымліва на сэрцы, душы.
Твой вобраз заўсёды са мною,
Чакаю, што вырашыш ты.
Дай знаць,
бо я толькі з табою.
Цябе не стае мне заўжды:
У спакоі і ў хвілі адчаю.
Цябе не стае ўсе гады,
Як свой паратунак, — чакаю.

Юрына ПАТАТА

Паэту Васілю Жуковічу

Абагаўляю словы,
Якія ў час зімовы —
Ад холаду замова.

Не магу паверыць,
Што не сніцца гэта:
Дзіўны свет струменіць
Шчырасцю паэта.
Скрозь — жыццё пульсуе,
Боскае натхненне.
Вабіць і чаруе
Чуласць і сумленне.
Слова зоркай ззяе,
Сцежкай вечнасці;
Шчодрасцю люляе
Чалавечнасці.
Не існуе пустэчы
Ні ў чым, нідзе.
Па колу крочыць вечар
Ды дзень брыдзе.
У кожнай рэчы — з'ява.
Спыніся... Пі.
Таемная выява,
Без нематы.
Пачуй прысутнасць духу,
Струмень жыцця.
У кожным кроку, гуку
Жывое дзіця.
Націнка. Павуцінка.
Расінка. Бор.
Усмешка. Аблачынка.
Рака. Чабор.
У кожнай з'яве — думка
Трымціць, пяе.
І робіцца так мулка
Спаць з-за яе.


Ласка Божая

Ласка Божая
Фарбай гожаю
Расцвітае ў жыцці маім;
Песняй здольнаю,
Сцежкай зорнаю
Наліваюцца цуда-дні.
Ласка Божая
Свет упрыгожвае,
Далеч кожная
Заварожвае.
Не спыняюся, —
Захапляюся;
Запытаюся, —
І здзіўляюся.
Ласка Божая
Фарбай гожаю
Саграваe бясконца Зямлю.
Ласка Божая,
Асцярожна — ўстрывожана
Я да сэрца цябе прытулю.

"Беларускае мястэчка"

Музею-майстэрні Міхаіла Рылко
ў Слоніме

Дзе струменіць Шчара-рэчка
І гараць каштанаў свечы,
"Беларускае мястэчка"
Ладзіць шчырыя сустрэчы.
Прoдкаў дух там ажывае
І збягаюцца стагоддзі,
Час няўмольны ход спыняе,
І камін ізноў у модзе.



Малюнак Эўгена ІВАНОВА

Малюю

Малюю восень
Фарбай смелай:
І неба просінь —
Думкай спелай.

Сонечны зайчык

Сонечны зайчык —
Шчасця акрайчык —
Спіць на далоні,
Лёсу ва ўлонні.

Каханак

Сівая ноч
пакінула скарынку, —
І толькі?
— Шчасця забыцця хвілінку —
Збяру букет
з апошніх кветак-зорак,
Дару іх табе,
пяшчотны золак.
Драмаць пачаў у стоме
бляклы месяц
Пад песні,
казкі састарэлых весніц:
Рыпенне надакучліва люляе,
Адно і тое ўсё апавядае.
Пускае карані
духмянасць ранку,
Здымае непатрэбную фіранку
Адчаю сярод думак палыновых.
І — ратаванне
ў спевах жаўруковых.
Нарэшце, ён,
сланечнік жоўты, ранак,
Ласунак жаўрука
і мой каханак.

Цвітуць васількі

Над неспакойным
І здрадлівым лёсам,
З самотнай вярбой
І праблескам вёсен,
З натхнёнай сяўбой,
Бязладным пакосам,
Дзе рукі міжволі
Кранаюцца крoснаў —
Цвітуць васількі...
На славу нябёсам,
Насуперак лёсу.
У думках, у росах.
Цвітуць васількі
На жытнёвых палосах.



Фотаэцюд Віталя ГІЛЯ



Алена РУЖ

Пад аховай белага крыла

***

У самоце
вечаровага змяркання
У парку,
што па-восеньску пусты,
У лістападным
шораху пытанняў
Знаёмыя не знойдуцца сляды.
Навошта зноў
маўклівае блуканне,
Ад берага да берага —
масты?
Не прызначай
чарговага спаткання
І не збірай кляновыя лісты.
Твой ліставей
шапоча прадказанне
Аб надыходзе
восеньскай сляты,
Не прымушай адказваць
на каханне,
Бо не квітнеюць
ў холадзе сады.
І выбачай хвіліну
ўсхвалявання,
Калі у парку зноў чакаеш ты.
Я, не сказаўшы слоў
на развітанне,
У прыцемках
згублюся назаўжды.

***

У тумане постаці знікаюць,
І здаецца шэрым гэты дзень.
Быццам пэндзлем
мастакі кранаюць
На сваіх малюнках
святлацень.
І чарговы раз тыя малюнкі,
З надыходам
восеньскай сляты,
Зробяцца
падманным паратункам
Тым,
хто развітаўся назаўжды.

***


Гушкаюць зімовыя вятры
Мае песні ціхія аб леце,
Ім спялі калыскай свае вецце
Наймудрэйшай сталасці бары.
Дачакацца б лепшае пары,
Калі прыйдзе лета
па прыкмеце,
Тады песні разнясе па свеце
Бусел, які ведае двары.
Любы край:
палі, азёры, ўзмежкі —
Пад аховай белага крыла,
Вабяць прыгажосцю
твае сцежкі —
Маці Божая
па іх калісьці йшла.
Стане песня лепшая мая
Пёркам белым у крыле бусла.

***

Зайздроснік ціха пажадаў:
— Каб у цябе было ўсё добра!
Ягоны тон занітаваў
У сэрцы шчырае "нядобра".
Апаліць гэткае слаўцо
І камянём сярод дарогі
Пакоіцца, каб вастрыём
Табе ці мне калечыць ногі.
Але зайздросціць — як паліць
Сваё дабро. Няўжо няўцяміць,
Чаму зайздросніку баліць
Душа ягоная і памяць.
Каменьчык толькі апячэ, —
Загоіцца чужая рана,
Хвароба зайздрасць пячэ
Слязой у спавядальны ранак.
Мо хтосьці скажа:
"Што з таго,
Бялюткай зайздрасць
шчэ бывае."
Але ж яна сястрыца той,
Якая душу апякае.

БОКС

У НАШЫХ БАКСЁРАЎ ЁСЦЬ ПЕРСПЕКТЫВЫ



Валерый Таржэцкі



Слонімскія баксёры Аляксей Бандалоўскі і Вадзім Трач

У Польшчы адбыўся шосты Міжнародны турнір па боксу на прыз Рамана Вілкуцкага, вядомага польскага трэнера, які выхаваў шмат знакамітых баксёраў. На гэтым турніры маладыя слонімскія баксёры Аляксей Бандалоўскі і Вадзім Трач занялі першае і другое месцы. Яны ўзнагароджаны граматамі і каштоўнымі падарункамі.

Карэспандэнт "ГС" сустрэўся з трэнерам па боксу Валерыем Таржэцкім і папрасіў яго расказаць пра перамогу нашых баксёраў.

— У гэтым Міжнародным турніры прымалі ўдзел баксёры з Польшчы, Літвы і Беларусі, якія нарадзіліся ў 1983—1986 гадах. Ён праходзіў два дні. Нашы хлопцы правялі па два баі і ўсе перамаглі. Аляксей нават перамог чэмпіёна Польшчы.

Дабіраліся мы ў Польшчу на маім аўтамабілі, нас там добра сустрэлі, і турнір праходзіў на самым вышэйшым узроўні. Гэта другія такія сур'ёзныя для нашых баксёраў спаборніцтвы... Першы раз мы ў лістападзе выступалі ў Малдове, дзе Аляксей Бандалоўскі там таксама перамог, — сказаў Валерый Віктаравіч.

Што датычыць перспектывы гэтых юных баксёраў, Валерый Таржэцкі адзначыў, што надзея ёсць. Але ў гэты нялёгкі від спорту трэба ўкладваць грошы. Найперш на якаснае харчаванне баксёраў, на паездкі, на трэніроўкі. На вялікі жаль, сёння адзіночныя віды спорту трымаюцца на голым энтузіязме. А каб засвяціцца спартсмену на вялікіх турнірах – яму трэба ў іх прымаць удзел,— адзначыў трэнер Валерый Таржэцкі.

Сяргей ЧЫГРЫН

БАСКЕТБОЛ

У СБОРНОЙ ЖЕНСКОЙ БАСКЕТБОЛЬНОЙ БУДЕТ НОВЫЙ ТРЕНЕР

Главный тренер женской баскетбольной сборной Виктор Белевич заявил о своем решении подать в отставку. Он не намерен с 1 января 2002 года продлевать контракт с Министерством спорта и туризма.

По словам Виктора Белевича, причина его ухода — в неудовлетворительном выступлении его подопечных в отборочном турнире чемпионата Европы 2003 года. Белорусские баскетболистки под руководством Белевича прошли квалификационный турнир и вышли в полуфинал, где проиграли все три поединка, и на сегодняшний день сохраняют мизерные теоретические шансы на выход в финал чемпионата субконтинента в 2003 году. 12 декабря на заседании исполкома Белорусской баскетбольной федерации президент Лев Пименов дал поручение найти нового кандидата на освободившуюся должность.

Как сообщил вице-президент Владимир Рассеко, имя нового наставника будет названо в конце декабря. Среди претендентов — экс-наставники сборной Анатолий Буяльский (главный тренер польской "Лончности") и Семен Халипский (главный тренер польской "Познани"), а также второй тренер женской национальной сборной Александр Лазовский, главный тренер юниорской сборной Андрей Вавлев, главный тренер молодежной сборной Александр Шимковяк и наставник борисовской "Березины" Григорий Калленто.

БелаПАН

ГАНДБОЛ

СПОРТ ОБНИЩАЛ

Розыгрыш предварительного этапа женского Кубка Беларуси по гандболу в прошлые выходные не состоялся по причине отказа команд.

Гродненская команда "Гродненчанка" и минская РУОР-БГПА-2 проигнорировали предыдущий этап розыгрыша Кубка Беларуси по гандболу, который должен был пройти в Гомеле. Вместе с местной командой "Университет" они должны были бороться за путевку в финал этого турнира. Однако на турнир гандболистки не прибыли. Как объяснил государственный тренер Игорь Юдчиц, причина неявки – в бедственном финансовом положении команд. Они оказались не в состоянии оплатить дорогу, питание и проживание во время турнира, хотя заявочные взносы уже были сделаны. Таким образом, «Гродненчанке» и РУОР-БГПА-2 было засчитано поражение, и в финал дан пропуск гомельскому "Университету".

ХАРТИЯ-97

ГИМНАСТИКА


СОРЕВНОВАНИЯ ОПРЕДЕЛИЛИ САМЫХ ЛУЧШИХ

На прошлой неделе, в спорткомплексе г. Слонима прошло первенство города по художественной гимнастике.

Эти соревнования проводила тренер Елена Макарская. Оценить работу молодой специалистки пришла Зоя Даниловна Петровская – основательница художественной гимнастики в Слониме, а ныне руководитель театра эстрадно-спортивного танца "Каскад". Также в судействе участвовали бывшие выпускницы ДЮШС №1 г. Слонима Екатерина Стрелковская, Диана Ефимович, Екатерина Филитович, Ирина Воскресенская. Судьи распределили места так.

Группа девочек (1988-1990 г.р.) выступала по программе кандидатов в мастера спорта. Первое место в упорной борьбе заняла самая грациозная среди гимнасток старшей подгруппы Марина Дембская (гимназия №1). Марина хорошо заявила о себе на спартакиаде СДЮШОР и ДЮСШ в г. Минске, которая проходила 14-18 декабря. Теперь девочка ждет вызов на сборы национальной команды республики Беларусь. Пальму первенства Марине уступила призер областной спартакиады Ольга Федорович (СШ №2). Третьей была Наталья Машлякевич (СШ№10). Следует отметить, что все эти девочки, включая Анну Сончик, защищают честь города Слонима на областных соревнованиях.

Во второй группе (девочки 1994-1996 г.р.) первое место заняла Александра Игнатик (гимназия №1), второе – Алена Афанасенко. За третье место боролись Алена Тарасик и Анастасия Фролова. И все-таки призовое место заняла Анастасия.



Марина Дембская во время разминки

Третья группа (девочки 1993 года) соревновалась по программе юношеского разряда. Первое место заняла Екатерина Игнатик (СШ №10), второе – Кристина Притулик и третье – Татьяна Пенталь.

Четвертая группа (девочки 1991—1992 г.р.) выступала по программе 2-го взрослого разряда. Первое место заняла Александра Шарох (гимназия №1). Эта девочка также входит в состав сборной команды города. Второе место досталось Анастасии Чудовой, третье – Юлии Полуяновой.

Победительниц наградили ценными призами и грамотами.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ХОККЕЙ

МИНИСТР ПОСЕТИЛ ТУРНИР

Министр внутренних дел Беларуси Владимир Наумов, в конце ноября занявший пост президента Федерации хоккея Беларуси, посетил начинающийся 18 декабря в Москве международный хоккейный турнир "Кубок "Балтики".

Как сообщил БелаПАН генеральный секретарь ФХРБ Александр Лещик, Наумов провел в российской столице один день в качестве почетного гостя турнира. Запланирована его встреча с руководством Федерации хоккея России и, в частности, с президентом этой организации Александром Стеблиным. Наумова будет сопровождать вице-президент ФХРБ, директор хоккейной школы "Юность" Анатолий Беляев. Турнир "Кубок "Балтики" пройдет с 18 по 22 декабря. В нем примут участие сборные России, Швеции, Чехии и Финляндии.

Дмитрий ВЛАСОВ

БИЛЬЯРД

КУПАВА – ЧЕМПИОН БЕЛАРУСИ

24-летний мастер спорта Игорь Купава (Брест) стал абсолютным чемпионом Республики Беларусь по бильярдному спорту 2001 года.

Матч на звание абсолютного чемпиона прошел 15 декабря в столичном бильярдно-спортивном центре "Пирамида". Организаторами выступили Белорусская ассоциация бильярдного спорта и Министерство спорта и туризма Беларуси. Помимо Игоря Купавы, за звание абсолютного чемпиона боролся и 25-летний мастер спорта Януш Маркоцинский (Барановичи). Оба игрока входят в состав сборной Беларуси по бильярдному спорту.

Матч по русскому бильярду велся в два этапа: игра в "пирамиду" до четырех побед и игра в "московскую пирамиду" до трех побед. В обоих случаях победил Купава.

Призы — телевизор и музыкальный центр — предоставил постоянный спонсор чемпионатов по бильярду производственное объединение "БелАЗ".

Леонид ОРЕШКО

ШАШКІ

ЮБІЛЕЙНАЯ ПЕРАМОГА

19 каманд сельскіх школ Слонімскага раёна змагаліся за тытул шашачнага чэмпіёна.

Юбілейную, дзесятую перамогу запар, атрымалі вучні Рахавіцкай сярэдняй школы. На гэты раз іх сапернікі змаглі толькі звесці ўнічыю дзве партыі, што не перашкодзіла Андрэю Зенаву і Юрыю Журовічу падзяліць першае месца ў асабістым заліку.


Другі год запар абсалютнай чэмпіёнкай стала Аксана Арцімёнка. Яна перамагла ўсіх сваіх саперніц. Шашысты з Дзераўной занялі другое месца, а жыровіцкія вучні сталі трэцімі. Сярод базавых школ вызначыліся шашысты з Вострава, Партызанаўкі і Парэчча.

Мацвей НАВІКЕВІЧ

прогноз погоды

Информация предоставлена сайтом www.meteo.by

19 - 26 декабря



Дата	19		20	
время суток	ночь	день	ночь	день
температура, С	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
скорость ветра, m/sec	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Дата	21		22	
время суток	ночь	день	ночь	день
температура, С	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
скорость ветра, m/sec	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Дата	23		24	
время суток	ночь	день	ночь	день
температура, С	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
скорость ветра, m/sec	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
Дата	25		26	
время суток	ночь	день	ночь	день
температура, С	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]
скорость ветра, m/sec	[illegible]	[illegible]	[illegible]	[illegible]

анекдоты

☺ 😐 ☹

Разговор между стюардессой и пассажиром арабской внешности сразу же после взлета:

- Что будете пить? Вино? Коньяк? Виски?

- Нет, нет! Что вы! Мне сейчас за руль садиться!

☺ 😐 ☹

Вот я: заплатил налоги и теперь спокойно сплю на лавочках, скамеечках, в садах и парках.

☺ 😐 ☹

Молодой человек решил похитить свою возлюбленную. Ночью он помог ей спуститься по веревочной лестнице. Они выбежали на улицу и, к счастью, тут же увидели такси. Машина доставила их в аэропорт.

- Вы не представляете, как мы вам благодарны, - сказал молодой человек водителю. - Сколько я вам должен?

- Ничего вы не должны. Папаша вашей спутницы все оплатил заранее.

☺ 😐 ☹

Поручик на празднике дает рубль денщику и говорит:

- Иди, найди себе девку поздоровее.

Утром встречаются.

- Ну как, девку себе нашел здоровую?

- Нашел, такая здоровая, насилу рубль обратно отобрал.

☺ 😐 ☹

- Что сегодня пьём?
- Да вот, вино сухое!
- Ну, насыпай!


☺ 😐 ☹

Подходит зебра к гаишнику и, смущаясь, говорит:

- Простите, а где вы это взяли?

КРОССВОРД

от Вадима АХРЕМКО



По горизонтали

5.Раздел физики, изучающий процессы излучения света, его распространения и взаимодействия с веществом. **6**.То, что скрывает, закрывает собой что–нибудь. **10**.Контора, канцелярия. **11**.Японское искусство составления композиций из живых или засушенных растений. **12**.Сорт конфет в виде вязких кубиков обычно шоколадного цвета. **13**.В религии: служитель Бога. **17**.Широко распространённый минерал, двуокись кремния. **19**.Человек, который устраивает скандалы с шумом и дракой. **20**. Волокнистый светлый огнеупорный минерал класса силикатов. **21**.Льстивый человек. **25**.Учреждение для выдачи ссуд под залог движимого имущества. **26**.Цельное или дроблёное зерно некоторых растений, употребляемое в пищу. **27**.Лицом к смотрящему. **30**.Цифровая отметка успехов. **32**.Маленькие деревянные ручные санки. **33**.Сельскохозяйственное орудие с широким металлическим лемехом и отвалом для вспашки земли. **34**.В музыке: четвёртая ступень гаммы. **35**.Нелепость, бессмыслица.

По вертикали

1.Произведения народного творчества — героические сказания, песни. **2**.Прибор для визирования. **3**. Спешная (по специальному заданию или по тревоге) работа на судне всей командой. **4**.Воспитательное и здравоохранительное учреждение для самых маленьких детей, где они находятся во время работы родителей. **7**.В Древнем Египте: каменное изваяние лежащего льва с человеческой головой; вообще скульптурное изображение такой фигуры. **8**.Потеря, ущерб, урон. **9**.Картина или узор из цветного стекла (в окнах, дверях). **14**.Высшее духовное лицо в православной, англиканской, католической церквах, глава церковного округа. **15**.Спортивная командная игра с мячом и битой, а также соответствующий вид спорта. **16**.Игра на специальном столе, при которой ударами кия шары загоняются в лузы. **18**.Мазь, употр. в медицине, косметике, технике. **22**.Полный беспорядок и развал. **23**.Традиционно установившиеся правила общественного поведения. **24**.Правовое положение. **28**.Садовое декоративное растение с крупными цветками различной окраски, обычно без запаха. **29**.Павильон, палатка для мелкой торговли. **31**.Венок из ветвей этого дерева как символ победы, славы, награды. **33**.Большой сад или насаженная роща с аллеями, цветниками, водоёмами.

ОТВЕТЫ НА кроссворд (№236)

По горизонтали

7. Памятник. **8**. Нежность. **11**. Смех. **12**. Мама. **13**. Даль. **14**. Душа. **17**. Пиджак. **18**. Вечер. **19**. Седина. **22**. Завод. **23**. Барабан. **25**. Городок. **27**. Чайка. **32**. Костёр. **33**. Костя. **34**. Самара. **37**. Мать. **38**. Роща. **39**. Клад. **40**. Боль. **43**. Свидание. **44**. Девчонка.

По вертикали

1. Паромщик. **2**. Утро. **3**. Витраж. **4**. Печаль. **5**. Снег. **6**. Старшина. **9**. Танец. **10**. Адресат. **15**. Рана. **16**. Река. **20**. Голос. **21**. Закат. **24**. Водолаз. **26**. Орёл. **28**. Край. **29**. Комарово. **30**. Штука. **31**. Крылечко. **35**. Дождик. **36**. Лайнер. **41**. Птах. **42**. Ночь.

ГОРОСКОП НА НЕДЕЛЮ

от www.ignio.com

ОВЕН

Вам необходимо проявить терпение, сдержанность в проявлении эмоций, тогда не возникнет ситуаций, препятствующих раскрытию вашего творческого потенциала. На вторник и среду лучше не планировать деловых встреч. Постарайтесь не быть чрезмерно упрямым - в яростных спорах и вежливых дискуссиях необходимо равно не только придерживаться своей точки зрения, но и слышать аргументы своих оппонентов. Может быть, пришло время изменить мироощущение и безжалостно выбросить устаревшие взгляды из Вашей жизни. Выходные порадуют Вас приятными событиями.

ТЕЛЕЦ

Вам потребуется сосредоточенность и пунктуальность для решения накопившихся проблем на работе. Понедельник и вторник - наиболее сложные дни на этой неделе, поэтому в эти дни лучше завершать начатые дела и быть предельно внимательным, дабы не совершить ошибок. Не пытайтесь объять необъятное, планируйте только то, что сможете реально осуществить. С понедельника по среду используйте возможность побыть дома и посвятить себя домашним делам.

БЛИЗНЕЦЫ

Вы озадачили себя слишком грандиозными планами, может быть, лучше их сократить, объективно оценив свои силы. Вероятны командировки в понедельник или в субботу, которые позволят Вам отвлечься от некоторых проблем. Ваши остроумные высказывания могут спровоцировать конфликтную ситуацию, потому следите за своей речью. В воскресенье, решая важные вопросы, прислушайтесь к советам близких и не отвергайте их помощь.

РАК

Посвятите понедельник и вторник отдыху и восстановлению сил, избегайте перегрузок на работе, лучше не начинать новых дел. В четверг постарайтесь не пропустить важной информации, которая будет способствовать Вашей финансовой стабильности. Неделя благоприятна перспективами в сфере профессиональной деятельности. Вспомните о своих друзьях, встреча в среду позволит Вам повеселиться от души и узнать много интересного.

ЛЕВ

С понедельника по среду лучше превратиться в невидимку, чтобы не привлекать к себе внимания. В понедельник можно рассчитывать на помощь близких людей. Вспомните о своем доме, позаботьтесь о его благоустройстве и уюте. Если Вас попросят о помощи, постарайтесь не отказывать и помогите по возможности. Займитесь самообразованием и повышением профессионального уровня. Воскресные события могут порадовать Вас многообещающими перспективами.

ДЕВА

Постарайтесь в начале недели избегать конфликтов с родными и Вам близкими людьми. В конце недели Вам могут предложить интересную работу. Посвятите обустройству своего дома хотя бы один день. Проявляйте щедрость своей натуры. Уделите своим детям достаточно внимания и позаботьтесь о них, они нуждаются в Вашей поддержке и Вашем мудром совете.

ВЕСЫ

Прекрасное время для творчества, оно позволит воплотиться в жизнь многим Вашим идеям и планам. Чтобы Вы владели ситуацией, Вам необходимо проявить решительность и инициативу. Приобретенный Вами новый опыт откроет для Вас новые возможности. Хорошее время для дружеских встреч. Ситуация может располагать к разрешению дел судебным порядком.

СКОРПИОН

Неделя располагает к приобретению новых знаний и навыков. Вы отважны, но не доходите в своей решительности до безрассудства. Постарайтесь не впутываться в авантюрные романтические истории, если не хотите угодить в слишком прочные любовные сети. Выберите время для усовершенствования Вашего быта. Используйте возможность побыть дома и посвятить себя домашним делам.

СТРЕЛЕЦ

Ваша способность находить верные решения может очень пригодиться Вам на этой неделе. Подумайте об ответственном шаге по карьерной лестнице, правда, в этот момент освободитесь от лишних эмоций, т.к. они могут стать помехой. Атмосфера на работе будет положительно влиять на Вашу работоспособность, и Вы сможете успеть сделать почти все, что запланируете. Вторник - удачный день для поездок, путешествий и командировок. Также в этот день может повезти представителям творческих профессий. В среду могут измениться планы, связанные с поездкой.

КОЗЕРОГ

Хорошее время для решения вопросов, которые до этой недели вызывали определенные трудности. Благоприятное время для принятия ответственных решений. Новые события, которые произойдут на работе, отвлекут Вас от грустных мыслей и даруют заряд оптимизма. Подумайте о повышении Вашего профессионального уровня. Примите приглашение старых друзей, оно очень важно для Вас. В четверг постарайтесь понять близких людей и не противопоставляйте себя их принципам.

ВОДОЛЕЙ

Неделя будет весьма насыщена событиями. Желательно объективно оценить свои возможности и распределить время и силы, т.к. работа может занимать почти все Ваше время. В среду могут возникнуть срочные и непредвиденные дела, которые потребуют от Вас сосредоточенности и внимания. В начале недели лучше сдерживать эмоции, чтобы избежать ненужных проблем. В пятницу пригласите своих друзей, и вечер пройдет изумительно.

РЫБЫ

Вы собраны и целеустремлены. Настало важное время, позволяющее раскрыть себя в профессиональном плане. Постарайтесь быть сосредоточенным и не тратьте свои силы по мелочам. Избегайте конфликтов с начальством. Обретя душевный покой и позабыв о мнительности - вряд ли в данный момент она удачный советчик - Вы будете чувствовать себя действительно по-королевски.

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.
ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Віктар ВАЛАДАШЧУК
ЗАСНАВАЛЬНІК Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі:
231800, г.Слонім, вул. Камсамольская, 8.
Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
...........(017)210-81-80
аддзел рэкламы 2-49-39
E-MAIL: gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by ПЭЙДЖЭР: 8-22-730000 аб. 95196

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.
Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

Падпісана да друку
19 снежня 2001г.
Час падпісання 7:00.
Надрукавана
ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г.Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)
ЗАКАЗ № 3939

Аб'ём — чатыры друкаваныя аркушы

